323.1 (47.60)
К1 85

*Пролетары ўсіх краеў, злучайцеся.*

Крыніцкі

# ВЫНІКІ

## і чарговыя задачы КП(б)Б па нацпытаньню

(прамова сакратара ЦК КПБ т. Крыніцкага 13 кастрычніка 1925 г.)

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выданьне АПА
Калінінскага Акругкому

КЛІМАВІЧЫ 1925 г

323.1 (47.60)
К 85

*Пролетары ўсіх краеў, злучайцеся.*

ДУБЛЕТНЫ ФОНД
Урадавай Бібліятэкі
імя Горкага
Аддзел № 36670

Урадавая Бібліятэка імя Горкага
Інв. № 348934

Н.Ф.

# ВЫНІКІ

## і чарговыя задачы КП(б)Б па нацпытаньню

(прамова сакратара ЦК КПБ т. Крыніцкага 15 кастрычніка 1925 г.)

Выданьне АПА
Калінінскага Акругкому

КЛІМАВІЧЫ 1925 г

# ВЫНІКІ
## і чарговыя задачы КПБ у справе нацыянальнай палітыкі.

**(Даклад тав. Крыніцкага на агульным сходзе актыву Менскай Гарадзкой Арганізацыі 15-га кастрычніка 1925 году аб выніках пленуму ЦК КПБ 12—15-Х 1925 году).**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Таварышы! Найважнейшым пытаньнем павесткі пленуму ЦК КПБ 12-15 кастрычніка быў даклад камісіі па нацыянальнай палітыцы. У гэтым дакладзе мы падрахавалі дасягненьні за апошні год, выявілі нашы недахопы, вызначылі, што рабіць далей.

У жыцьці Беларусі нацыянальнае пытаньне займае вялікае мейсца. Правільнай пастаноўцы і вырашэньню яго КПБ аддае і доўга будзе аддаваць вялікую ўвагу.

### Агульная пастаноўка пытаньня.

Як мы ў агуле ставім пытаньні нацыянальнай палітыкі, мы—камуністычная партыя?

У працівагу дробна-буржуазнаму падыходу мы „замест фармальнай раўнапраўнасьці нацый на першы

плян ставім **рэальную дапамогу** раней прыгнечаным нацыянальнасьцям у **справе ўздыму іх культуры і раней усяго—яе эканамічнай базы**". Аб гэтым проціпастаўленьні двох пунктаў гледжаньня мы нядаўна перад арганізацыяй ужо ставілі пытаньне, а іменна—Бюро ЦК гэта пытаньне ставіла ў справаздачы, якую было мне даручана апублікаваць, згодна пастановы Бюро ЦК КПБ—іменна ў дакладзе „Аб асаблівасьцях унутрыпартыйнага становішча".

Вы памятуеце, таварышы, там я **цытаваў** з аднэй кніжкі, якая прызначалася да выданьня, аўтара, які, гаворачы аб Беларусі, як аб самастойнай дзяржаве, **сапастаўляў** часткі Беларусі, што носяць розныя назвы, напрыклад: „Усходнія крэсы ў **Польшчы**, Заходняя вобласьць у Расеі", „Гэткія часткі ляжаць у суседніх з Беларусьсю дзяржавах і носяць розныя назвы... хоць населены ўсюды беларусамі". І тады ў дакладзе я ставіў пытаньне іменна так, як гэта толькі можна ставіць: што супроць **такой** пастаноўкі пытаньня ў Беларускай Рэспубліцы, супроць **такой** „самастойнай дзяржавы" мы супярэчым.

(Я **агаварваюся**: быць можа аўтар гэтай кніжкі выпадкова чаму-небудзь прапусьціў гэткую фармуліроўку пытаньня). Па сутнасьці, гэткае сапастаўленьне Польшчы і „Расеі" азначае замазваньне клясавага боку справы, замазваньне вялізарнай розьніцы ў палітычным і сацыяльным укладзе Польшчы і Расеі, азначае пастаноўку на выключнае месца моманту нацыянальнага. Калі ў такой агульнай пастаноўцы гаворыць аб „самастойнай" дзяржаве, дык гэта значыць, гаварыць аб „**самастойнай дэмакратычнай Беларусі**". Мы супроць **гэткай** „самастойнай" Беларусі.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Мы ёй праціўпастаўляем **нашу самастойнасьць БССР**, якая пабудована на аснове праграмы РКП і вызначана канстытуцыяй нашага саюзу (правы аж да „права свабоднага выхаду з Саюзу“ (Канстытуцыя СССР, Разьдз. 2, арт. 24, п. 4).

„Самастойная дзяржава БССР“ гэта азначае: уклад дыктатуры пралетарыяту; дапамога рабочае клясы нашага Саюзу прыгнечанай у мінулым нацыянальнасьці; дапамога ў культурн. і эканаміч. адносінах; на гэтай іменна аснове дабраахвотны саюз нашай дзяржавы з інш. падобнымі дзяржавамі (з пастаянна дзейнічаючым „правам выхаду з Саюзу“).

І мы лічым, што толькі рабочая кляса, толькі пралетарская рэвалюцыя [illegible] правільна вырашыць нацыянальную праблему. Толькі на гэткай аснове прынцып дабраахвотнага саюзу зьяўляецца **дзейным**. На аснове гэткай дабраахвотнасьці, ва ўмовах палітыкі Камуністычнай партыі выяўляецца, што Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік мацнее і будзе мацнець далей.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Вынікі ў гаспадарчай галіне.

Пытаньні нацыянальнай палітыкі ў нас, у БССР, трэба разглядаць іменна заўсёды пад гэткім агульным пунктам погляду. Мы на пленуме маглі адзначыць **рад дасягненьня**ў за год: „Работа КПБ у гаспадарчай галіне прывяла да некаторага ўздыму прамысловасьці, палепшаньня стану сялянскай гаспадаркі, узмацненьню фінансавай сыстэмы, павышэньня ўзроўню быту рабочых і сялян. **Гаспадарчы ўздым стварае аснову для разьвіцьця і пашырэньня працы ў галіне нацыянальнай палітыкі**“. (Рэзалюцыя пленуму 1,3).

Зразумела, мы не пераўвялічваем нашых дасягненьняў у гэтых адносінах. Урад БССР у сёлетнім годзе пачаў ставіць больш выразна ва ўвесь рост пытаньне аб дапамозе Саюзам Беларусі, як адсталай краіне. Зразумела, у саюзным урадзе гэта пытаньне аб дапамозе нацыянальным рэспублікам заўсёды стаяла і стаіць, але найбольш актыўна мы пачалі ставіць гэта пытаньне прыблізна з пленуму ЦККПБ, што адбыўся ў студзені. Рад паасобных пытаньняў аб дапамозе нам, як адсталай краіне, мы за год паставілі. Мы маем некаторыя дасягненьні. Зараз, перад пачаткам бюджэтнага году, мы ставім гэта пытаньне ва ўвесь рост у зьвязку з агульнымі плянамі адбудаваньня гаспадаркі БССР (бюджэт, заяўкі па надзвычайнаму бюджэту, заяўкі з пазыкі адбудаваньня). Ужо па папярэдніх спраўках мы ўпэўнены, што Беларусь зможа ўнесьці ў свой бюджэт, у звычайны і надзвычайны, у наступным годзе болей, чым у мінулым годзе.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Наш бюджэт вельмі дэфіцытны: зусім не пакрывае патрэб адбудаваньня. Мы ўпэўнены, што дапамога Саюзу будзе значная. У далейшым пленум перад Бюро ЦК паставіў пытаньне аб тым, каб мы прадаўжалі гэту лінію на ўсё большае прыцягненьне дапамогі саюзу.

## Эканамічны і культурны ўздым БССР

Зразумела, нельга праціўпастаўляць двох бакоў справы, нельга так тлумачыць, што эканамічны ўздым краіны і культурны ўздым краіны—гэта рэчы розныя. Ня так стаіць пытаньне.

Бюро ЦК КПБ, у маім дакладзе на актыве, ставіла пытаньне аб небясьпечнейшым, як мы гаварылі,

„культурніцкім ухіле“ ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі, якi зьяўляецца прадуктам уплыву, галоўным чынам, дробна-буржуазнай інтэлігэнцыі. Выяўляецца ён у тым, што некаторыя працаўнікі лічаць, што нацыянальная палітыка іменна ў тым зьмяшчаецца, каб працаваць раней усяго над культурным разьвіцьцём, над культурным уздымам краіны. Гэта самы шкодны ўхіл, бо пры ім забываецца **асноўны** бок справы—эканамічны ўздым, без якога ніякі культурны ўздым немагчымы. Але зусім няправільна прадстаўляць і так, што лічыць эканамічную працу аснаўною—гэта значыць замазваць, затушоўваць другі бок справы—культурнае будаўніцтва. Гэтыя два бакі пытаньня нельга праціўпастаўляць, нельга рабіць простай і ўрэзваць складаную формулу, якая зьмяшчаецца ў тым, што на базе эканамічнага росту прадаўжаецца і павялічваецца культурны рост. Гэта складаная формула, і мы іменна за такую формулу. Мы супроць аднабокасьці, як супроць аднабокасьці ў бок „культурніцкага ўздыму“, так, зразумела (хоць мы не наглядаем такога ўхілу) былі-б заўсёды супроць такога тлумачэньня нацыянальнай палітыкі, што, нібыта, уся яе задача ня ў культурнай працы, а ў тым, каб эканамічна ўзьняць краіну. Мы лічым, што праца над мовай, асабліва над беларускай, перавод дзяржаўнага партыйнага апарату і прафэсыянальных арганізацый на мову насяленьня, разьвіцьцё школы на роднай мове, разьвіцьцё літаратуры, забясьпечаньне сапраўднага раўнапраўства моваў, высоўваньне, выхаваньне працаўнікоў з асяродку раней прыгнечаных нацыянальнасьцяў, асабліва правядзеньне беларусізацыі і шмат што іншае—усё гэта **важнейшыя**

задачы, над якімі трэба яшчэ многа працаваць, і ў галіне гісторыі мы зрабілі яшчэ не даволі.

Лінія КПБ у гэтай галіне правідловая—аб гэтым гавораць дасягненьні, якія ў нас ёсьць.

## Станоўчыя ітогі ў справе беларусізацыі.

Пленум ЦК прызнаў, што ў радзе галін працы адносна беларусізацыі дасягнуты пэўныя посьпехі. Яны невялікія, калі параўнаць з тым, чаго мы хацелі-б, але **вельмі значныя, калі параўнаць з тым, што мы мелі год таму назад.** Я думаю, што па тых матар'ялах, якія мы далі для арганізацыі, вы прачытаеце дэтальныя падрабязныя данныя. Я прывяду толькі больш асноўныя лічбы з дакладу камісіі па нац. палітыцы пры ЦВК БССР.

### Школа.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У галіне народнай асьветы ў часьці ранейшай БССР, уся пачатковая беларуская працоўная школа пераведзена на беларускую мову.

У далучаных частках выкладаньне ў першых групах пераведзена на беларускую мову.

У 7-хгодках з беларусізацыяй справа стаіць здавальняюча.

У вышэйшай школе мы пачалі праводзіць беларусізацыю, напр., на 1-м курсе рабфаку часткова яе ўвялі.

Таксама і ў адносінах да іншых нацыянальнасьцяў у галіне школьнае справы мы маем дасягненьні.

У галіне палітасьветнай сеткі: клюбаў, нар. дамоў, хат-чытальняў мы маем ужо шэраг устаноў на беларускай мове.

У сэнсе перападрыхтоўкі настаўнікаў, правядзеньня курсаў беларусазнаўства і летніх курсаў па перападрыхтоўцы, пр з якія прапушчана звыш 1000 чалавек, мы маем дасягненьні. Мы, таварышы, можам адзначыць, як станоўчы бок справы, што настаўніцтва, асабліва вясковае, дапамагае нам у правядзеньні працы ў вёсцы. Мы можам значную частку беларускага настаўніцтва, у большым процанце, аднесьці да тэй часткі інтэлігэнцыі, якая сапраўды блізка да партыі, якая ня толькі на словах, а і на чыне праводзіць нашу лінію.

## Інстытут Беларускае Культуры.

Далей, у працы Інстытуту Беларускае Культуры пленум прызнаў: „Вітаць некаторыя вынікі, галоўным чынам, падрыхтоўчую працу Інстытуту Беларускае Культуры“. На жаль наша арганізацыя, партыйная і камсамольская, ня зусім належна зьвязана з працай Інбелкультуту і ня зусім належна ўцягнута ў яе. Да Інбелкультуту трэба прыкаваць далёка больш увагі ўсяе арганізацыі, усіх рабочых і ўсіх працоўных вёскі.

Усяго ў Інбелкульце арганізована і больш-менш актыўна працуе 10 сэкцый, з іх сэкцыя мастацтва, прыродазнаўства і сельскай гаспадаркі маюць рад падсэкцыяў. Пры Інстытуце Беларускай культуры працуе, апроч таго, 15 пастаяных камісій: па дыялектыцы, слоўніку, правапісу вывучэньню Беларусі і беларускіх народных песень, гісторыі і археолёгіі, вывучэньню рэвалюцыйнага руху Беларусі, па вывучэньню народнай гаспадаркі, па выданьню твораў Леніна і Маркса, вывучэньню сав. будаўніцтва, этнаграфіі, бібліографіі, працуе цэнтральнае бюро краязнаўства (яно, між інш. абапіраецца на 10 акруг.. і



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

75 раёенных т-ваў краязнаўства), аб'яднаньне „Навуковая Арганізацыя Працы“ і ўсебеларускае аб'яднаньне паэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“. У складзе Інбелкульту ёсьць аддзелы яўрэйскі і польскі. Як бачыце, таварышы, вельмі вялікія і значныя дасягненьні.

Арганізацыі Інбелкульту за мінулы год уцягнулі ў сваю працу шмат кваліфікаваных інтэлігентаў беларускіх, яўрэйскіх і польскіх. Вядома, было-б ня верна пры гэтым казаць, што у Інбелкульце гэта высока-кваліфікаваная інтэлігенцыя, якая выйшла не з пралятарскага асяродзьдзя ў большай частцы, што яна ня з намі, што яна з намі толькі на словах. Вядома, некаторая частка яе ў поўнай меры нашу палітыку ня прызнала, на словах толькі прыняўшы яе; гэта тая частка, якая, як і фармуліравана ў дакладзе „не перайшла мяжы, што аддзяляе яе ад дыктатуры рабочае клясы“. Мы прызнаём недахваты гэтай часткі інтэлігенцыі, але адначасна мы ведаем, што прадстаўнікі гэтай часткі таксама перапрацоўваюцца ў працэсе працы супольна з намі, набліжаюцца да нас. І да гэтай часткі мы цалкам адносім словы, якое ў чацвёртым палітычным лісьце ЦК падкрэсьліваў, што „трэба на ўсё 100 проц. выкарыстаць веды гэтых людзей, прыцягваць іх да будаўніцтва новага грамадзтва, абкружаць атмасфэрай таварыскіх адносін і давер'я поўнай простасьці і шчырасьці“. Так мы ставілі гэта пытаньне. Прызнаньне памылак — гэта ня ёсьць цкаваньне і завушэньне асобных прадстаўнікоў дробна-буржуазнай інтэлігенцыі; гэта **ёсьць адзін сродак да таго каб дапамагаць тым людзям, якія на справе хочуць працаваць з рабочаю клясаю і з**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Камуністычнай партыяй, дапамагаць вызваліцца ад сваіх памылак, няўхільных і абумоўленых тым, што людзі вышлі не з пралетарскага асяродзьдзя, выхаваліся на матар'яле буржуазнай культуры.**

## Маладняк.

Я, таварышы, павінен асоба спыніцца на групе „Маладняк". Адзін вельмі адказны таварыш на адказным сходзе ня так даўно заявіў: „Маладняк" гэта аб'яднаньне дробна-буржуазнае і кулацка-шавіністычнае". Гэта палітычная памылка. У „Маладняку" шмат элемэнтаў, якія зьяўляюцца плоцьцю ад плоці Камуністычнай партыі сяброў КПБ і КСМ. У „Маладняку ёсьць шмат беспартыйных людзей, якія добра перапрацоўваюцца ў нашым партыйным і камсамольскім катле. Мы ня плюшчым вочы на тое, што ў шэрагах „Маладняка", вядома, ёсьць частка, якая яшчэ не перапрацавалася і не адмовілася ад цэлага шэрагу дробна-буржуазных ухілаў і тым ня менш мы лічым, што з літаратурных груп гэта аб'яднаньне найбольш нам блізкае, найбольш каштоўнае, найбольш шматабяцаючае. Вядома, ёсьць шмат слабых мейсц у гэтай арганізацыі. Вядома арганізацыі „Маладняк" трэба дапамагчы і вельмі шмат дапамагчы і з боку партыі і камсамолу адхіліцца ад памылак.

## Форма і зьмест культуры

Я прыводзіў у дакладзе па пытаньню аб нацкультуры формулу Сталіна. „Нацыянальная па форме, пралетарская па зьместу:—такая агульна-чалавечая культура, да якой ідзе сацыялізм". Вядома, нельга ўяўляць сабе так, што мы ўжо прыйшлі да такога

становішча. І ў большасьці літаратурных аб'яднаньняў, у многіх літаратараў (няхай яны сябе лічаць „пралетарскімі“ і зьяўляюцца пралетарскімі) яшчэ няма пэўнай вытрыманасьці, дасканальнага вызваленьня ад усякіх праяваў дробна-буржуазнага ўплыву, бываюць „зрывы“ і ўхілы. Зусім ясна,—мы павінны і заўсёды будзем патрабаваць таго, каб у **бок ажыцьцяўленьня формулы Сталіна** разьвіваўся, загартоўваўся і ўзмацняўся ўсякі літаратурны рух, усякая культурная праца, уся наша нацыянальная палітыка. Але ясна, што да такога становішча мы яшчэ не дайшлі на 100 проц. Нам патрэбна яшчэ шмат працаваць, каб дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня гэтай формулы.

Паўтараю, мы можам адзначыць ітог: арганізацыя „Маладняк“ за год значна ўзмацавалася, пашырылася, мае шмат сваіх ячэек, працуе над сабою ў бок падбліжэньня да лініі камуністычнай партыі, выжываючы ўхілы ў сваіх асобных частках.

## Выдавецкая справа.

Далей, таварышы, па лініі выдавецкае справы таксама маем значны ўзрост выдавецкай працы.

Досыць сказаць, што з 1 студзеня да 25 жніўня гэтага году выпушчана літаратуры: беларускай 755.000 экз., яўрэйскай—35.000 экз., расейскай—24.000 экз. З 821.000 экземпляраў, як бачыце, беларускай літаратуры выпушчана 755.000 экз.

У выніку, за год мы маем павялічэньне выпуску беларускай літаратуры на 129 проц., яўрэйскай—на 130 проц. польскай—на 108 проц. і расейскай—зьмяншэньне на 45 проц. Іначай кажучы, Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва ў сваей працы ўлучае най-



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

большае месца беларускай літаратуры і пры гэтым удзельная вага гэтай працы Бел. Дзярж. Выдавецтва павялічваецца.

## Праца ў дачыненьні да яўрэйскага насяленьня.

На відавоку дасягненьні па працы ў дачыненьні да яўрэйскага насяленьня. Трэба адзначыць ажыцьцяўленьне пляну земляупарадкаваньня яўрэяў за гэты год на 96 проц. Гэта зьяўляецца вялікім дасягненьнем. Па лініі саматужнікаў праца пакуль што йдзе, галоўным чынам, арганізацыйная; прайшлі раёнпыя і акруговыя канфэрэнцыі і ўсебеларускі зьезд саматужнікаў. Пачынае разгортвацца і гаспадарчая праца дапамогі і падсабленьня ім. Значна палегчана падатковае абкладаньне саматужнікаў. Вызначаны шэраг захадаў на дапамогу саматужнай прамысловасьці.

## Праца сярод палякаў.

Па лініі польскіх школ таксама ёсьць дасягненьні. У польскіх сельсаветах праведзена, галоўным чынам, праз нашых польскіх працаўнікоў і ўсю партыю, значная праца па расслаеньню польскага сялянства, вызваленьню беднаты і серадняков з пад уплыву польскай кулацкай вярхушкі.

## Чырвоная армія

Далейшае пытаньне—праца ў Чырвонай арміі. У гэтым годзе мы дабіліся, што ў Аб'яднанай Беларускай вайсковай школе кампалітсклад і пэдагагічны склад на 45 проц. ужо ўладае беларускай мовамю,

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

курсанты на 60 проц. У тэрытарыяльнай нашай дывізіі мы мелі летась у кампалітскладзе 41 проц. а ў сучасны момант 61 проц. У цэлым, раней па дывізіі ўладала беларускай мовају 25 проц. кампалітскладу, а ў сучасны момант—50 проц. Праца вядзецца па падрыхтоўцы да беларусізацыі 33-яй тэрытарыяльнай дывізіі і да таго, каб правесьці беларусізацыю ўва ўсім тэрытарыяльным корпусе.

## Беларусізацыя ўстаноў.

Далей, беларусізацыя ўстаноў. Да студзеня быў пераведзены на беларускую мову толькі Народны Камісарыят Асьветы, некаторыя аддзелы нарасьветы і на тры чвэрці апарат ЦВК. У цяперашні час, згодна вестак нацыянальнае камісіі пры ЦВК БССР, мы ўжо маем цалкам пераведзеным на беларускую мову ЦВК з яго камісіямі, Беларускі Дзяржаўны Музэй, Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, усе акруговыя аддзелы нарасьветы, Калінінскі Акруговы Выканаўчы Камітэт з яго аддзеламі і бадай што ўсімі раёнными выканаўчымі каміт. і с. с. (уданным выпадку Калінінская акруга, як і па ўсіх лініях беларусізацыі, ідзе наперадзе іншых акругаў) Пры ўсіх акруговых выканаўчых камітэтах заснованы камісіі па правядзеньню нацыянальнае палітыкі.

У нацыянальным складзе выбарных савецкіх органаў маюцца дасягненьні галоўным чынам, па лініі выраўненьня процанту беларусаў. Раней у ліку членаў акруговых выканаўчых камітэтаў было 48 проц. беларусаў, цяпер іх ёсьць 65 проц. У раённых выканаўчых камітэтах беларусаў было 75 проц., цяпер

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

іх ёсьць 80 проц., у сельсаветах было 84 проц., цяпер ёсьць 91 проц.

Гэта ня кажа аб „засільлі беларусаў, гэта ёсьць выраўніваньне па процанту нацыянальнага складу жыхарства. Калі казаць аб гарадзкіх саветах, дык і тут процант, бадай, што адпавядае процанту нацыянальнасьці гарадзкога жыхарства; беларусаў каля 40 проц., яўрэяў—30 проц. з лішкам, велікарусаў —20 проц., палякоў 3—проц., іншых—6 з лішкам процантаў. Мы маем правільную прапорцыю.

## Нацыянальная палітыка ў прафэсыйных саюзах.

Трэба адзначыць дасягненьні ў нацыянальнай палітыцы прафсаюзах, якія зьдабытыя за год. Саюз працаўнікоў асьветы цалкам перайшоў на беларускую мову, таксама і саюз працаўнікоў зямлі і лесу. Швэйнікі цалкам перайшлі на яўрэйскую мову. Падрыхтоўваецца перавод саюзу працаўнікоў скуранага вырабу на яўрэйскую мову. Саюз нарсувязі падрыхтоўваецца да пераводу на беларускую мову.

Трэба адзначыць тое-ж самае выраўненьне процанту беларусоў за мінулы год і па прафэсыйных арганізацыях. У цэнтральных, акружных і мясцовых прафсаюзных органах беларусаў у мінулым годзе было 39 проц., а ў гэтым годзе іх ёсьць 45 проц.

## КСМ і КПБ.

Надзвычайна цікавыя лічбы па камсамолу, масавае арганізацыі, якая блізкая да нас. Па складу арганізацыі, мы бачым павялічаньне процанту бела-

русаў з 63,8 проц. да 70 проц. Таксама і па лініі кіраўнічых органоў, асабліва ў райкомах, лік процанту беларусаў павялічыўся з 50 проц. да 56 проц. (у РК-з 54 да 57 проц.)

Унутры КПБ, таварышы, мы маем у складзе выбарных асоб павялічаньне беларусаў з 30 проц. да 48 проц. За год наглядалася вялікае зьніжэньне для яўрэяў, палякаў і велікарусаў, асабліва вялікае зьніжэньне для велікарусаў, іменна з 28 проц. да 18 пр.

Значыць, тут ёсьць значнае выраўніваньне ў складзе кіраўнічых партыйных органаў—цэнтральных і акружных.

## Задачы па беларусізацыі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Мы, таварышы, лічым, што гэтыя дасягненьні значныя, параўноўваючы з тым, што было год таму назад. Вядома, нельга пераўвялічваць, але ня трэба і пераўмяншаць іх. Ня трэба скардзіцца і ныць, што у нас „так многа ня зроблена“, што „нам нічога не ўдаецца“. Мы маем дасягненьні таму, што **шлях партыі быў пэўны**. Заплюшчваць на гэтыя дасягненьні вочы, ня бачыць іх, не прызнаваць таго, што ёсьць —**гэта значыла-б казаць, што нашая лінія няпэўная.**

Пленум ЦК КП(б)Б гэтае агульнае пытаньне перад сабою ставіў і яшчэ раз прызнаў асноўнымі для агульнага кірунку працы ў рэзалюцыі ліпнёўскага пленуму 1924 г. і студнеўскага 1925 г. Лінія КПБ па нацыянальнай палітыцы павінна і далей цягнуцца. КПБ і камсамол да гэтае працы яшчэ мала дачынены, некаторыя сябры партыі гэтае працы не разумеюць. І адзначаючы дасягненьні і пэўнасьць шляху, Пленум так і кажа: „Справа беларусізацыі яшчэ толькі перажывае пачатковую пару росквіту!“.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы